*Расціслаў Бузук*

# ФАЛЬКЛОРНЫ ТЭАТР І ГРАМАДСТВА

Беларускі тэатр ў нацыянальнай мастацкай культуры нашага народа – з'ява старажытная і ў значнай ступені ўнікальная. Абумоўлена гэта ў першую чаргу асаблівасцямі нацыянальнай гісторыі беларусаў і эстэтычнай прыродай сцэнічнага мастацтва як складанага і адметнага віду творчай дзейнасці чалавека на розных этапах развіцця цывілізацыі. Асабліва актуальнай на сучасным этапе гістарычнага развіцця беларускай тэатральнай культуры з'яўляецца праблема навуковага асэнсавання новых функцый і задач сцэнічнага (у тым ліку і фальклорнага) мастацтва ў заўсёды складаных і супярэчлівых грамадскіх стасунках, абумоўленых карэннымі зменамі ў сацыяльна-эканамічных сферах жыцця, працэсамі паступовага і няўмольнага ўкаранення і пашырэння рынкавых законаў у дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва розных форм уласнасці.

Каб лепш зразумець і ўсвядоміць разнастайныя складаныя праблемы беларускага тэатра, мэтазгодна азірнуцца на вытокі і традыцыі, што сілкавалі нацыянальны тэатр беларусаў, развівалі яго творчы патэнцыял, выпрацоўвалі пэўныя асаблівасці.

Першая і прынцыпова важная асаблівасць тэатра як віду мастацтва заключаецца ў тым, што ён заўсёды знаходзіцца ў кантэксце часу. У якасці мінулага ў адносінах да культурных феноменаў заўсёды выступае традыцыя, што спалучаецца з такімі паняццямі, як духоўнасць, карані, вялікая спадчына. Сёння па-рознаму разумеецца слова "традыцыя", па-рознаму да яе ставяцца, тым больш цяпер, калі адбываецца актыўнае інфармацыйна-культурнае "сашчэпліванне" розных паралельных традыцый.

Між тым фальклорны тэатр спрадвек выконваў шэраг функцый: гэта і фарміраванне поглядаў на жыццё, і эстэтычная адукацыя, і маральнае выхаванне, і задавальненне попыту на лучнасць паміж людзьмі і інш. Вельмі часта тлумачэнне яго сацыяльнага прызначэння залежала ад палітыкі. Напрыклад, у царскай Расіі ў адносінах да навуковых прац па фальклоры панавалі патрабаванні падначаліць іх служэнню ідэям праваслаўя, самадзяржаўя і народнасці; у фашысцкай Германіі імкнуліся выкарыстоўваць фальклярыстыку для прапаганды расісцкіх ідэй; у савецкі час яна служыла выхаванню атэіста-інтэрнацыяналіста і інш.

Тлумачэнне грамадскай ролі фальклорнага тэатра – актуальная праблема не толькі для ўсіх часоў і народаў, але і кожнага новага пакалення. Здавалася б, для грамадскасці нашай краіны яна злабадзённая, асабліва ў сувязі з тым, што фальклорны тэатр бярэ пачатак з рэчаіснасці. Але айчыннае этнатэатразнаўства пакуль не паказала, якія яго адносіны да сучаснасці менавіта фальклорнага тэатра і якімі сродкамі валодае гэтая галіна духоўнай культуры беларусаў. Тым не менш паспрабуем ахарактарызаваць тэндэнцыі, што існуюць у вызначэнні функцый фальклору, і на іх аснове вызначыць сацыяльнае прызначэнне фальклорнага тэатра беларусаў.

Сучасныя падыходы ў адносінах да фальклору і фальклорнага тэатра беларусаў, да яго грамадскай ролі складваюцца ў краіне на падставе тэарэтычных прац папярэдніх пакаленняў вучоных.

Некаторыя падзяляюць "утылітарны" погляд на фальклор, які, перафразуючы словы Г. В. Пляханава [2, с. 226], узнікае і замацоўваецца там, дзе ёсць узаемнае спачуванне паміж значнай часткай грамадства і тымі людзьмі, якія больш ці менш прыхільна і дзейнасна, актыўна цікавяцца вуснай культурай, фальклорам.

Іншыя ў поглядах на сацыяльную ролю даследуемай галіны духоўнай культуры беларусаў прытрымліваюцца "эстэцкай" канцэпцыі "фальклор для фальклору". Іх адносіны, у тым ліку і да фальклорнага тэатра, узнікаюць на глебе "безнадзейнага разладу з навакольным асяроддзем, з рэчаіснасцю" [3, с. 273]. У іх публіцыстычных артыкулах часцей сустракаюцца матывы адмаўлення знешніх для аўтэнтычнага фальклору мэт, акрамя праблем самаруху, самаіснавання.

Вузкі, монафункцыянальны погляд на сацыяльнае прызначэнне фальклору толькі як на сродак сувязі чалавека з богам (камунікатыўная функцыя) мае вытокі ў сярэднявеччы, у першую чаргу ў хрысціянскай эстэтыцы, якая надавала ўсяму духоўнаму жыццю таго часу толькі такую адзіную, "сапраўдную" сацыяльную ролю. Памкненні "вузка" ставіцца да функцый фальклору вынікаюць і з эстэтыкі Гегеля, з яго разумення ролі духоўнасці як спосабу самапазнання абсалютнай ідэі, пазнання законаў развіцця аб'ектыўнай рэчаіснасці.

У вызначаным радзе монафункцыянальных поглядаў на фальклор трэба ўзгадаць і тых навукоўцаў, якія зводзілі яго ролю (у тым ліку і фальклорнага тэатра) толькі да функцыі сацыяльна-арганізацыйнай (выхавання калектывізму), або толькі да ролі гістарычнай крыніцы, што дапамагае даведацца пра тое, якім грамадства было ў старажытнасці. Ролю фальклору зводзілі да спосабу пазнання рэчаіснасці, які адрозніваецца ад навуковага толькі дакладна-пачуццёвай формай, або да функцыі сацыяльнай лучнасці. Гэтую функцыю разглядалі ў якасці выхавання "класавай псіхаідэалогіі" або толькі як функцыю чыста эстэтычную, нават эстэцкую.

Значны ўплыў на разуменне грамадскай ролі фальклору аказалі ў свой час эстэтычныя погляды А. В. Луначарскага. На паказаную галіну духоўнай культуры беларусаў часам глядзелі нібы яго вачыма і бачылі яе прызначэнне ў тым, каб "служыць прыладай пазнання жыцця, арганізоўваць ідэі і асабліва эмоцыі" [1, с. 318]. Пры гэтым трэба падкрэсліць, што яго літаратуразнаўчы падыход да фальклору як да помніка "літаратурнага значэння" аўтаматычна пераносіў на гэтую галіну духоўнай культуры беларусаў і самі функцыі пісьмовага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працілеглы, поліфункцыянальны падыход да сацыяльнага прызначэння фальклору ў нашым грамадстве – прызнанне за фальклорным тэатрам пазнаваўча-асветніцкай, маральна-ўзвышальнай і нават геданістычнай функцый. Карані такога падыходу да функцыі фальклорнага тэатра можна знайсці таксама ў глыбокім мінулым. Матывы гэтага погляду знаходзяць сваё адлюстраванне яшчэ ў філасофскіх поглядах Арыстоцеля і ў некаторых ідэях эпохі Асветніцтва. Формула "павучаючы забаўляць", якой энцыклапедысты вызначалі грамадскую ролю мастацтваў, сёння таксама пераносіцца на фальклор.

У наш час дзяржаўныя ўстановы культуры звяртаюць увагу на аўтэнтычныя формы вуснай культуры, фальклор, традыцыйныя рамёствы. У дзейнасці клубных устаноў усё больш важнае месца займаюць рытуалы і святы земляробчага календара, сямейныя абрады. Тыя ж працэсы назіраюцца і ў некаторых агульнаадукацыйных школах, дзе вядзецца праца па выкарыстанні ідэй этнапедагогікі, этнізацыі асобы, захаванні і развіцці фальклору, этнакультуры не толькі беларусаў, але і тых народаў, якія здаўна жывуць і ствараюць свае мастацкія, у пэўнай ступені, этнічныя скарбы. На базе некаторых сельскіх і гарадскіх школ розных рэгіёнаў дзейнічаюць эксперыментальныя фальклорныя калектывы, у якіх асноўным зместам навучання і выхавання з'яўляюцца тэатральны фальклор, традыцыйныя рамёствы, фальклорная музыка, спевы, танцы і іншыя. На фальклорны тэатр сёння ўсё часцей пачынаюць глядзець і як на крыніцу эстэтычных радасцей, і як на "падручнік для жыцця", спосаб яго ідэалагічна-ацэначнага асэнсавання.

Сярод поліфункцыянальных поглядаў на сацыяльнае прызначэнне фальклору адзначым самы распаўсюджаны ў нашай краіне. Маецца на ўвазе ўзгаданы вышэй погляд на фальклор (і, зразумела, на фальклорны тэатр) як на "асобны від мастацтва". Менавіта тут у сістэме названых вышэй поліфункцыянальных поглядаў вызначаецца і "месца фальклору ў сістэме мастацтваў", і адпаведна чатыры яго функцыі: геданістычная, камунікатыўная, асветніцкая і выхаваўчая. Такі мастацтвазнаўчы падыход, на першы погляд, быццам дапамагае ўзняць грамадскую ролю фальклору. Але разам з тым ён у пэўнай ступені прыніжае іншыя яго функцыі і сацыяльнае прызначэнне, таму што ігнаруе сувязь з міфалогіяй, жыццём і побытам.

У апошнім дзесяцігоддзі XX стагоддзя лік функцый, якія ўласцівы мастацкаму фальклору, паступова ўзрастаў. У фальклоры пачалі вылучаць функцыі ўнушэння і прадказання, сацыяльна-арганізуючую (або грамадска-пераўтваральную), канцэптуальную, камунікатыўную (або інфармацыйна-камунікатыўную), геданічную (або геданістычную), асветніцкую, кампенсацыйную, аптымізуючую, эўрыстычную і інш.

З цягам часу з'яўляліся ўсё новыя варыянты вызначэння функцый мастацтва, якія не маглі не паўплываць на разуменне грамадскіх абавязкаў фальклору і, зразумела, фальклорнага тэатра. Акрамя ўзгаданых вышэй сацыяльных функцый (камунікатыўнай, геданістычнай і сацыяльна-арганізуючай) сталі вызначаць яшчэ і пазнавальную, сацыяльную, каштоўнасна-арыентацыйную, семіятычную, відовішчную і эстэтычную. Такім чынам, лік асноўных функцый мастацтва паступова павялічваўся. Сёння да іх можна дадаць яшчэ дзве функцыі, якія можна ўключыць у кола сацыяльнага прызначэння фальклорнага мастацтва. Гэта катарсісная і забаўляльная функцыі.

Асэнсоўваючы функцыі фальклорнага тэатра нагадаем, што гэтая работа не завершана, не ўсе сацыяльныя абавязкі фальклору і фальклорнага тэатра вызначаны. Трэба і надалей вырашаць праблемы, якія існуюць з вывучэннем функцыі задавальнення попыту на той або іншы від лучнасці. Праца ў гэтым кірунку дапаможа выйсці на шляхі доказнага, пераканаўчага паказу ўзаемаадносін фальклорнага тэатра і рэчаіснасці, уяўлення пра іх як пра заканамерна арганізаваную шматузроўневую сістэму.

**Спіс літаратуры:**

1. Луначарский, А. В. Собрание сочинений : в 8 т. / А. В. Луначарский. – М. : Худож. лит., 1967. – Т. 7 : Эстетика. Литературная критика. Статьи, доклады, речи (1903 – 1928). – 734 с. : ил.
2. Плеханов, Г. В. Искусство и литература / Г. В. Плеханов; вступ. ст. М. Розенталя; ред. и коммент. Н. Ф. Бельчикова. – М. : Гослитиздат, 1948. – 320 с.
3. Чернышевский, Н. Г. Эстетика / Н. Г. Чернышевский; вступ. ст. и примеч. Г. А. Соловьева. – М. : Гослитиздат, 1958. – 375 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ